Источник: "Звязда" - 2015-10-29

## Родныя тапонімы

# «ДВАРЫ ПАНСКІЯ, ШЛЯХЕЦКІЯ, БАЯРСКІЯ»



**На вашы пытанні адказвае старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ**

***Паважаная рэдакцыя! Патлумачце, калі ласка, паходжанне назвы вёскі Прыдвор'е Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці, якая знаходзіцца непадалёк ад нашай Чырвонараніцкай сельскай бібліятэкі, у якой мы працуем бібліятэкарамі.***

***Алена МЕДЗЮК, Таццяна ГУРКО.***

Назва вёскі *Прыдвор'е* ў сваёй аснове змяшчае старажытнае агульнаславянскае слова *«двор»*. Па сведчанні прафесара В.П. Лемцюговай, у X стагоддзі двор быў вядомы ў значэннях «жыллё», «сядзіба», «дом», у XI—XII стагоддзях — як «уладанне князя з маёмасцю і чэляддзю, у пазнейшы перыяд — пераважна як комплекс жыллёвых і гаспадарчых пабудоў з зямельнымі ўгоддзямі, «сядзіба». На ўсходнеславянскай тэрыторыі населеныя пункты з назвай Двор і вытворнымі ад яе сустракаюцца надзвычай часта. Масава паселішчы з такімі назвамі сталі з'яўляцца ў час актыўнага развіцця феадальнага землеўладання.

Ва ўмовах Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай двор вызначаўся пэўнымі спецыфічнымі рысамі. Побач з раннефеадальнымі вялікакняжацкімі дварамі, што служылі гаспадарчымі і палітычнымі цэнтрамі ў XV стагоддзі на тэрыторыі Беларусі і Украіны, пад польскім гаспадарчым уплывам з'явіліся двары панскія, шляхецкія, баярскія, якія прыраўноўваліся да маёнткаў. Двары ў той час размяшчаліся адасоблена ад астатніх паселішчаў, яны з'яўляліся галоўнай часткай зямельнай уласнасці гаспадара. У межах панскіх уладанняў былі двары-фермы, прызначаныя для апрацоўкі зямлі і ўтрымання свойскай жывёлы, сялянскія двары як адзінкі падаткаабкладання, а за межамі дворнай пашні, у пушчах і на рэках — двары або станы ў месцах палявання, рыбнай лоўлі і бортніцтва. Якая з катэгорый двара, што існавалі на той час, была пакладзена ў аснову тапоніма Прыдвор'е на сённяшні дзень, адназначна адказаць складана.

***P.S. Шаноўныя чытачы! Вас цікавіць, што азначае назва горада, вёскі ці мястэчка, у якіх вы жывяце? А можа, той мясцовасці, адкуль вы родам? Вам хочацца ведаць, адкуль пайшлі найменні пэўных урочышчаў, лясоў, азёр, што размяшчаюцца ў вашай мясцовасці? Тады дасылайце свае лісты з пытаннямі на адрас:***
***220013, г. Мінск,***
***вул. Б. Хмяльніцкага, 10а,***
***газета «Звязда».***
***Або па электроннай пошце:***
***igumenski@mail.ru з пазнакай «Родныя тапонімы».***